ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
16
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 2 (1488)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
ТЭЛЕТАЙП
•УЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА•

### БЮРО ПАРТКОМА

зацвердзіла саставы і планы работы сектараў партыйнага камітэта на 1986 год.

У. САТОЛІН.

•

### ДА 10 ЛЮТАГА

пройдзе грамадска - палітычная атэстацыя супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта пад дэвізам «XXVII з'езду КПСС — дастойную сустрэчу!».

Мэта атэстацыі — садзейнічаць фарміраванню у членаў ВЛКСМ камуністычнай перакананасці, актыўнай жыццёвай пазіцыі, умення выкарыстоўваць веды марксісцка-ленінскай тэорыі ў прафесійнай і грамадска-палітычнай дзейнасці, выхаванню грамадзянскай адказнасці.

Задачы грамадска-палітычнай атэстацыі — ацаніць актыўнасць кожнага камсамольца ў выкананні рашэнняў партыі, дапамагчы намеціць перспектывы далейшага ідэйнага, духоўнага, прафесійнага росту.

Асаблівая ўвага будзе надавацца ўдзелу членаў ВЛКСМ у рашэнні канкрэтных сацыяльна-эканамічных задач калектыву.

Вынікі грамадска-палітычнай атэстацыі будуць шырока асвятляцца «Камсамольскім пражэктарам».

С. СЯРГЕЕЎ,
сакратар камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў.

•

### СЁННЯ

адкрыты партыйны сход фізічнага факультэта абмяркуе работу партыйнай групы кафедры ядзернай фізікі па кіраўніцтву камсамольскай арганізацыяй.

Т. РУДКОЎСКАЯ.

•

### ДАДАТКОВЫ НАБОР

аб'яўляе студыя бальнага танца (кіраўнік М. Я. Продан). Запіс — у студэнцкім клубе, аўдыторыя 401 галоўнага корпуса.

М. ТАРАСАВА,
мастацкі кіраўнік клуба.

## Гарачыя зімовыя дзянёчкі

АПЕРАТЫЎНЫ ФОТАРЭПАРТАЖ






ЯК ХУТКА, як імкліва ляціць час! Здаецца, яшчэ ўчора мы сядзелі каля ёлкі, сустракаючы Новы год. А сёння прайшло ўжо паўмесяца з таго моманту. Забываецца святочнае вяселле, патухлі агеньчыкі на ёлках, цацкі занялі сваё звычайнае месца на антрэсолях. І зноў будзённыя

(Працяг на 2—4 стар.).

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

**Ва ўмовах паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, крутога павароту да інтэнсіфікацыі вытворчасці асаблівае значэнне набывае якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Пакінуўшы студэнцкую аўдыторыю і прыйшоўшы ў сферу навукі ці вытворчасці, яны павінны хутка і з поўнай аддачай уключыцца ў рашэнне самых складаных задач. Гэтыя пытанні пастаянна знаходзяцца ў цэнтры ўвагі камсамольскай арганізацыі універсітэта, яны сталі прадметам сур'ёзнага, крытычнага аналізу на пленуме камітэта камсамола.**

## ВЫМЯРЭННЕ ЧАСАМ

ПЛЕНУМ КАМІТЭТА камсамола адкрыў сакратар А. Казулін. У прэзідыуме — намеснік сакратара партыйнага камітэта В. А. Прокашава, загадчык аддзела Мінскага абласнога камітэта ЛКСМБ А. Чулкоў, першы сакратар Маскоўскага РК ЛКСМБ А. Мішын.

З дакладам «Аб рабоце камсамольскіх арганізацый факультэта прыкладной матэматыкі і геаграфічнага факультэта па павышэнню адказнасці камсамольцаў за якасць ведаў, глыбокае і трывалае авалоданне выбранай спецыяльнасцю» выступіў старшыня штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта Ю. Варатніцкі.

Разглядаючы пытанні павышэння якасці падрыхтоўкі выпускнікоў, дакладчык спыніўся на тым, наколькі поўна рэалізуюць камсамольскія арганізацыі факультэтаў магчымасць актыўна ўздзейнічаць на эфектыўнасць вучэбнага працэсу, усямерна ўмацоўваць вучэбную дысцыпліну. Адзначалася, што камітэтамі камсамола вядзецца пошук новых форм акадэмічнай работы. Па водгуках студэнтаў ФПМ, апраўдвае сябе практыка правядзення аператыўных нарад па пытаннях вучэбнай дысцыпліны. Гэтыя нарады штотыднёва праводзяцца камсоргамі, старастамі і куратарамі ў групах першага і другога курсаў.

Пры высокай абсалютнай паспяховасці сярэдні бал на геаграфічным факультэце не падымаецца вышэй 3,85, а колькасць студэнтаў, якія не маюць троек, знізілася да 34 працэнтаў. Амаль што традыцыйнай стала наяўнасць на ФПМ 8—9 працэнтаў двоечнікаў. А дзве трэці студэнтаў вучацца на тройкі.

Падрыхтоўка спецыялістаў-троечнікаў не можа сёння задавальняць. Якія ж рэзервы павышэння якасці ведаў? Перш за ўсё неабходна грунтоўна ўсвядоміць, што забяспечыць падрыхтоўку маладога спецыяліста, які адпавядае патрабаванням часу, можна толькі, актывізаваўшы ролю камсамольскага калектыву акадэмічнай групы ў вучэбным працэсе, павысіўшы маральную адказнасць кожнага камсамольца за якасць ведаў. Элементы неарганізаванасці, фармалізму, а часам і беспрынцыповасці, якія маюцца ў акадэмічнай рабоце камсамольцаў ФПМ і геаграфічнага факультэта, не дазваляюць ім у поўнай меры рашаць гэтыя задачы.

Прыходзіцца прад'яўляць сур'ёзныя прэтэнзіі камітэту камсамола геафака (сакратар — Т. Кругленя, намеснік па акадэмрабоце — І. Амброс). Акадэмічная работа на пасяджэннях камітэта камсамола аналізуецца вельмі рэдка. Апошняя пастанова камітэта камсамола геафака, накіраваная на паляпшэнне вучэбна-выхаваўчай работы, датуецца снежнем 1983 года. Склалася парадаксальная сітуацыя, калі намеснік сакратара камітэта камсамола па акадэмічнай рабоце І. Амброс вымушана працаваць без падтрымкі і калектыўнай парады камітэта камсамола. Як вынік гэтага — адсутнасць узаемадзеяння з камсоргамі груп, іх слабая выканаўчая дысцыпліна ў пытаннях акадэмічнай работы, зніжэнне агульнага ўзроўню вучэбна-выхаваўчай работы ў групах.

У рабоце акадэмічных сектараў абодвух факультэтаў адсутнічае імкненне да аналізу вучэбнай дысцыпліны. Не заўсёды да прагульшчыкаў і двоечнікаў прымаюцца адпаведныя меры. У акадэмічных сектарах факультэтаў, напрыклад, пры праверцы «Камсамольскім пражэктарам» універсітэта не знайшлося дакладнай інфармацыі аб такіх студэнтах. Пры падрыхтоўцы да пленума прыйшлося карыстацца звесткамі дэканатаў.

Эфектыўным сродкам паляпшэння якасці ведаў павінна стаць сацыялістычнае спаборніцтва паміж акадэмічнымі групамі. Хаця на геаграфічным факультэце і ФПМ яго вынікі рэгулярна падводзяцца, студэнты інфармаваны дрэнна. На геафаку толькі ў дзвюх групах з сямі студэнты змаглі назваць месца, якое займае іх калектыў. Гэтага ж не ведаюць нават некаторыя члены камітэта камсамола факультэта. На ФПМ за мінулы год вызначаны толькі пяць лепшых і горшая група. Зразумела, што ў такой сітуацыі большасць груп не можа нават ацаніць сваё становішча ў факультэцкім спаборніцтве.

Камсамольскія арганізацыі геаграфічнага факультэта і ФПМ яшчэ не рэалізуюць у поўнай меры прынцып калектыўнай адказнасці камсамольскай групы за якасць ведаў. У ходзе гутарак з камсамольцамі на 1—4 курсах ФПМ і геафака высветлілася, што гэтае пытанне сур'ёзна ў большасці груп не абмяркоўвалася. За мінулы і сёлетні вучэбны год у групах і на факультэтах мала прынята канкрэтных мер да камсоргаў і акадэмсектараў горшых груп, часцей за ўсё іх толькі папярэджвалі.

Невысокая патрабавальнасць і непаслядоўнасць часта характарызуюць работу вучэбна-выхаваўчых камісій. На ФПМ вучэбна-выхаваўчая камісія — камсамольскі орган. Але магчамасць грамадскага, камсамольскага ўздзеяння на прагульшчыкаў і двоечнікаў выкарыстоўваецца не заўсёды. Чаго каштуе пасяджэнне ВВК ад 26 лютага мінулага года, на якім па 11 асабістых справах прыняты стэрэатыпныя рашэнні: «Аб'явіць папярэджанне і хадайнічаць перад дэканатам аб прадаўжэнні тэрміну здачы запазычанасцей». Зусім нядаўна, 6 снежня, калі выйшлі ўсе тэрміны пераздач, ВВК вымушана была заслухаць 16 студэнтаў, якія маюць запазычанасці па практыцы. Прынята 16 пастаноў, у кожнай — патрабаванне здаць залік да 14 снежня. Скажам прама: і тым, хто прымаў гэтыя пастановы, і тым, хто павінен быў іх выконваць, было зразумела, што ў сілу шэрагу прычын у тэрмін іх не выканаць. Тым не менш гэтыя пастановы былі прыняты. І палова з іх не была выканана.

Актыўную ролю ў павышэнні патрабавальнасці да вучэбнай дысцыпліны камсамольцаў павінны іграць штабы «Камсамольскага пражэктара» факультэтаў. У сёлетнім навучальным годзе з выбраннем новага старшыні штаба «КП» Васіля Еніча гэта работа на геаграфічным факультэце актывізавалася. Аднак штабы «КП» рэдка яшчэ звяртаюцца ў дэканаты, камітэты камсамола, камсамольскія арганізацыі груп з канкрэтнымі прапановамі аб пакаранні парушальнікаў вучэбнай дысцыпліны, удасканаленні акадэмічнай работы. На факультэтах яшчэ не ўвайшлі ў практыку сумесныя пасяджэнні штабоў «КП» і ВВК па разгледжанню перса-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

СЕСІЯ... СЕСІЯ... СЕСІЯ...

# Гарачыя зімовыя дзянёчкі





(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

размовы: Справы, справы, справы...

Спытайце ў любога студэнта, калі ў яго самы клапатлівы час? І кожны адкажа — зараз, у зімовую сесію. Нават па адзнаках у залікоўках відаць, што зімовая сесія больш цяжкая, чым летняя. Бясспрэчна. Чым гэта тлумачыцца? Хто яго ведае! Можа тым, што на зіму ўсё жывое ўпадае ў спячку. А чым горшы студэнт за тое жывое? І наадварот — па вясне ўсё нараджаецца і абнаўляецца, хвалюецца, дорыць цёплае, светлае, добрае. Нават выкладчыкі. Можа быць!

Але ўсё гэта з воблесці роздуму, фантазіі. Мы ж існуем у рэальнасці. Прыйшла зімовая сесія. І кожны па-рознаму, са сваім асабістым скарбам ведаў, здабытых за семестр, прыйшоў да гэтага рубяжу, да гэтай вучэбнай прыступкі.

Для Анжалікі Якуценка, студэнткі І курса V групы хімічнага факультэта гэта сесія — першая. І таму асаблівая. Зразумела!.. Усе залікі Анжэла атрымала, як гавораць студэнты, аўтаматам. Фотааб'ектыў зафіксаваў дзяўчыну перад апошнім залікам па вышэйшай матэматыцы.

На сёмым паверсе хімічнага факультэта цішыня. Крыху ніжэй

(Працяг на 3—4 стар.).

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# ВЫМЯРЭННЕ ЧАСАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

нальных спраў двоечнікаў і прагульшчыкаў, што было раней рэкамендавана «Камсамольскім пражэктарам» універсітэта.

Недахопы ў рабоце камітэтаў камсамола факультэтаў, як у люстэрку, адлюстроўваюцца ў акадэмічнай рабоце камсамольскіх груп.

У групах не заўсёды на належным узроўні вядзецца планаванне акадэмічнай работы. Напрыклад, у многіх акадэмічных групах геаграфічнага факультэта адзіным пунктам у месячных планах з'яўляецца: рэгулярна запаўняць экран бягучай паспяховасці. А ў другой групе III курса геаграфічнага факультэта са снежня 1984 года пытанні вучэбна-выхаваўчай работы ў месячных планах нават не ўспаміналіся.

Пятую групу IV курса ФПМ, здаецца, усе чатыры гады хвалявалі толькі пытанні паляпшэння работы кансультацыйных пунктаў. З 1982 года прынята 12 пастаноў камсамольскіх бюро і сходаў, у якіх патрабуецца «Умацаваць работу кансультацыйных пунктаў». У мінулым навучальным годзе пытанні акадэмічнай работы разглядаліся на пяці камсамольскіх сходах. Было вырашана: звесці колькасць пропускаў заняткаў да мінімуму, добрасумленна адносіцца да вучобы... Толькі ніводнага разу не была дадзена па-сапраўднаму прынцыповая ацэнка таго, што ў групе няма выдатнікаў, 7 студэнтаў займаюцца практычна толькі на тройкі.

У працэсе выхавання будучых маладых спецыялістаў высокая патрабавальнасць павінна спалучацца з прапагандай станоўчага прыкладу лепшых студэнтаў, павышэннем прэстыжу выдатнікаў вучобы. Тут нельга замыкацца на такіх шаблонных формах работы, як чытанне традыцыйных лекцый для першакурснікаў. Вечары і прэс-канферэнцыі з выдатнікамі, правядзенне алімпіяд па спецпрадметах — вось тыя формы работы, якія павінны выпрабаваць саветы выдатнікаў. На жаль, на ФПМ апошні існуе толькі на паперы. І самі студэнты ведаюць у лепшым выпадку толькі аб факце яго існавання. Частку функцый савета ўзяла на сябе ВВК.

Некалькі лепш становішча на геаграфічным факультэце. Тут аформлены новы стэнд «Лепшыя студэнты факультэта», выпушчаны нумар насценнай газеты. Аднак у плане работы на бягучы год толькі тры з адзінаццаці пунктаў накіраваны на работу з шырокім колам студэнтаў факультэта. Не дзіўна, што ў акадэмічных групах мала ведаюць аб рабоце савета выдатнікаў. Вясной на факультэце прайшоў злёт выдатнікаў. Аднак ён не паставіў перад лепшымі студэнтамі факультэта ніякіх канкрэтных задач па ўдзелу ў вучэбна-выхаваўчай рабоце.

У значнай ступені гэтыя недахопы тлумачацца і недапрацоўкай савета выдатнікаў універсітэта (старшыня — А. Пагірніцкая). План работы універсітэцкага савета на 90 працэнтаў «звернуты на сябе». І арыентуе ў першую чаргу на стварэнне выдатнікам дадатковых умоў для вучобы, навуковай і грамадскай работы. Думаецца, прыйшоў час універсітэцкаму савету выдатнікаў звярнуцца да больш надзённых задач у сваёй рабоце.

Сёння неабходна звярнуць увагу на тое, што на камсамольскіх сходах, пасяджэннях ВВК, у выпусках «Камсамольскага пражэктара» крытыкуюцца тыя, хто нядобрасумленна авалодвае ведамі. У той жа час ствараецца ўражанне, што камсамольцы прымірыліся з «ціхімі троечнікамі», якія складаюць дзве трэці студэнтаў названых факультэтаў. Больш таго, ў рашэннях камсамольскіх сходаў шэрагу груп ФПМ існуе толькі хадайнічанне аб выдзяленні троечнікам стыпендый. А назначэнне стыпендый студэнтам, якія маюць адну-дзве тройкі, стала звычайнай з'явай. Гэта — нікуды не вартая пазіцыя. Толькі пачаўшы ўжо сёння непрымірымую барацьбу з троечнікамі, мы будзем гатовы да рашэння задач карэннага паляпшэння якасці падрыхтоўкі выпускнікоў ВНУ.

Адным з фактараў, якія значна павышаюць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў, памяншаюць перыяд іх адаптацыі на вытворчасці і ў навуковых установах, з'яўляецца далучэнне вучэбнага працэсу да рэальнай навукі, далучэнне студэнтаў да навукова-даследчай работы ў перыяд навучання.

На факультэце прыкладной матэматыкі сёння працуюць 3 студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, 11 студэнцкіх навуковых гурткоў. Навукова-даследчай работай у пазаўрочны час займаецца каля 700 студэнтаў. На факультэце самы вялікі працэнт студэнтаў, якія ўдзельнічаюць у рабоце па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы. Студэнты таксама ўдзельнічаюць у створаных вучэбна-навукова-вытворчых аб'яднаннях «БДУ — НДІ ЭВМ», «БДУ — «Інтэграл», «БДУ — «Планар». Каля 500 студэнтаў факультэта штогод выступаюць на навуковых канферэнцыях, 15 студэнтаў публікуюць вынікі навукова-даследчай работы. Не кожны факультэт можа ганарыцца тым, што практычна ва ўсіх групах штогод праводзяцца камсамольскія сходы па навуковай рабоце. Іншае пытанне, што якасць гэтых сходаў пакідае жадаць лепшага (часта гэта проста справаздачы групы па НДРС).

Геаграфічны факультэт на працягу некалькіх гадоў у аглядзе-конкурсе па навукова-даследчай рабоце студэнтаў займае IV—V месцы. На факультэце працуе 9 студэнцкіх навуковых гурткоў, створаны 2 студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі з цікавай праблематыкай і, вядома, са сваімі праблемамі. Вядзецца работа па стварэнню яшчэ адной НДЛ на факультэце. Добрых вынікаў дабіваюцца студэнты геаграфічнага факультэта на конкурсах навуковых работ. Штогод каля 10 студэнтаў публікуе вынікі НДР.

Адзначаючы дасягненні, пэўныя поспехі, мы не павінны забываць пра тое, што перашкаджае ў арганізацыі навукова-даследчай работы на факультэтах.

Да ліку такіх фактараў адносіцца нізкае тэхнічнае забеспячэнне. Напрыклад, сёння забяспечанасць вылічальнай тэхнікай студэнтаў ФПМ у чатыры разы ніжэйшая ў параўнанні з аналагічным факультэтам Томскага універсітэта. Нават з улікам таго, што ў ім у два разы меншая колькасць студэнтаў. Студэнты факультэта, якія павінны ўжо на III курсе быць з вылічальнай тэхнікай на «ты», практычна не маюць доступу ў дысплейныя класы і кабінеты міні-ЭВМ, не гаворачы аб персанальных камп'ютэрах.

У ВНУ краіны штогод праводзіцца шмат розных навуковых канферэнцый, карысць ад наведвання якіх для студэнтаў, што цікавяцца навуковымі даследаваннямі, была б бясспрэчнай. Але пабываць на іх — праблема. Да нас прыязджае шмат студэнтаў з розных куткоў краіны. Іх чамусьці камандзіруюць ВНУ. А ў нас камандзіроўка практычна немагчыма. Гэта пытанне адрасуецца перш за ўсё рэктарату.

Як паказалі анкетаванне і «круглы стол», існуе праблема навуковага кіраўніцтва, асабліва гурткамі і НДРС. Хацелася б, каб гэтыя пытанні знаходзіліся ў цэнтры ўвагі адміністрацыі. Там, дзе кіраўнік на сваім месцы, працуе з ініцыятывай, ёсць і эфект. У сувязі з гэтым адміністрацыя павінна дэталёва прадумаць сістэму стымулявання кіраўніцтва НДРС. Камітэтам камсамола факультэтаў неабходна паставіць перад кафедрамі пытанне аб далучэнні да гэтай работы маладых, энергічных выкладчыкаў, якія змогуць зацікавіць студэнтаў навукай. Тады не прыйдзецца «Камсамольскаму пражэктару» ФПМ задаваць пытанне: «Чаму не ідуць студэнты ў некаторыя навуковыя гурткі?».

Існуюць праблемы з арганізацыяй работы навукова-вытворчых атрадаў на ФПМ. У падрыхтоўчы перыяд камсамольцы выконвалі работы для аднаго прадпрыемства. На працу летам яны былі залічаны з вялікімі цяжкасцямі ў розныя арганізацыі. Вось і паўстае ў байцоў атрада пытанне: «Чаму на ўсіх узроўнях гавораць аб важнасці той справы, якую мы робім, а калі дайшло да практычнай работы, нам не далі рэалізаваць у поўнай меры патэнцыял атрада?» Большую зацікаўленасць у гэтай справе мог бы праявіць і штаб працоўных спраў універсітэта.

Зразумела, што работу па фарміраванню навукова-вытворчых атрадаў неабходна праводзіць на фізічным факультэце і факультэце радыёфізікі і электронікі. Але неабходна прасіць дапамогі ў рашэнні шэрагу праблем у вышэйстаячых камсамольскіх органаў.

Неабходна адзначыць, што студэнты ФПМ пачынаюць уносіць свой уклад у навучанне школьнікаў камп'ютэрнай пісьменнасці. Разам з лекцыямі, якія чытаюць старшакурснікі ў школах, створаны гурток, які прыступіў да распрацоўкі праграм, што дэманструюць школьнікам у час экскурсій на ВЦ БДУ магчымасці ЭВМ. Адначасова павышаецца і кваліфікацыя студэнтаў у галіне праграміравання, якія працуюць у гуртку.

Але гэтую работу можна разглядаць толькі як першы крок па ўдзелу ФПМ у камп'ютэрызацыі сярэдняй школы. Ужо зараз можна ставіць пытанне перад органамі народнай асветы аб стварэнні перасовачнага класа на навучальных асновах камп'ютэрнай пісьменнасці. Пры ўмове, аднак, што абслугоўваць яго будуць студэнты ФПМ і факультэта радыёфізікі і электронікі. Вопыт такой работы ў нашай краіне ёсць. Ён паказвае, што яна з'яўляецца істотным укладам у азнаямленне школьнікаў, перш за ўсё сельскіх, з вылічальнай тэхнікай.

У спрэчках па дакладу выступілі: І. Амброс, намеснік сакратара камітэта камсамола геаграфічнага факультэта, Л. Панчанка, сакратар камітэта камсамола ФПМ, Р. Чыж, сакратар камсамольскага бюро гістарычнага факультэта, Г. Позняк, намеснік сакратара камітэта камсамола ФПМ па навуковай рабоце, А. Кавалёва, старшыня штаба «КП» юрыдычнага факультэта, Э. Волкава, старшыня НСС геаграфічнага факультэта. На пленуме выступіў загадчык аддзела Мінскага абласнога камітэта ЛКСМБ А. Чулкоў.

У прынятай пастанове пленум прапанаваў камітэтам камсамола канкрэтызаваць работу па рэалізацыі прынцыпу калектыўнай адказнасці за якасць ведаў студэнтаў. На пасяджэннях камітэтаў камсамола факультэтаў, ВВК, нарадах акадэмічных сектараў прымаць канкрэтныя меры да камсоргаў, адказных за акадэмічную работу груп, у якіх заніжана патрабавальнасць да парушальнікаў вучэбнай дысцыпліны. Акадэмічнаму сектару камітэта камсамола універсітэта даручана распрацаваць канкрэтныя прапановы, накіраваныя на павышэнне ролі камсамольскіх арганізацый ва ўмацаванні вучэбнай дысцыпліны. Укараніць вопыт ФПМ па пашырэнню правоў камсамольскіх арганізацый у пытаннях вучэбнай дысцыпліны на ўсіх факультэтах, выдаваць накіраванні на пераздачу экзаменаў па ўзгадненню з акадэмсектарамі камітэтаў камсамола факультэтаў, адлічваць студэнтаў за парушэнні вучэбнай дысцыпліны толькі па хадайніцтву камсамольскіх органаў. Пленум абавязаў камсамольскія арганізацыі ФПМ, фізічнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі развіваць работу па ўдасканаленню дзейнасці навукова-вытворчага атрада і пачаць работу па стварэнню часовых творчых маладзёжных калектываў у рамках аб'яднанняў «БДУ — «Інтэграл», «БДУ — «Гранат».

В. ЮР'ЕЎ,
С. ГОГАЛЬ.

# ЗАТРЫМАННЕ

ПА ГОРАДУ ішоў вайсковы патруль... Сёння ў ім былі падпалкоўнік В. В. Беспразваны і маёр В. І. Вараб'ёў. Маршрут пралягаў па ваколіцы Мінска, там, дзе Ленінскі праспект пераходзіць у Маскоўскую шашу. Мароз хапаўся за веткі дрэў, твары прахожых, але мокрыя сняжынкі імкнуліся перабіць яго, адвярнуць лістапад ад зімы. Людзі спяшаліся — хто ў каляровыя вітрыны-дзверы магазінаў, хто — дамоў, гуляць у такое надвор'е не прываблівала самых адчайных рамантыкаў.

А двум афіцэрам з чырвонымі павязкамі яшчэ некалькі гадзін несці патрульную службу, назіраць за парадкам. Снег пайшоў хутчэй, як бы нейкую свабоду адчуў вецер і шаленымі парывамі налятаў на ўсё жывое.

Насустрач ім крочыў чалавек у вайсковай форме. Але без шыняля, у фуражцы. Падышлі бліжэй. Прапанавалі прад'явіць дакументы. Прапаршчык (пакуль што яны не ведалі, хто гэта на самай справе, таму будзем называць яго так, без ускосся) быў не паголены, доўгія валасы спадалі на лоб, хавалі вочы.

Дакументаў не было.

— Да што вы, таварышы! Я — у адпачынку. Вось выскачыў у магазін. Машына чакае за вуглом. Адпусціце, прычоска сапраўды нікуды не вартая. Вінаваты, заўтра ж схаджу ў цырульню. У-у, холад які, вам зусім тут, відаць, няўтульна. Ну, што — я пабег.

Ён усміхнуўся і кінуў у бок рукой, дзе стаялі жоўтыя «Жыгулі».

— Штосьці я адразу адчуў непрыемнае, было відаць, што гэты чалавек чымсьці ўзрушаны і спрабуе згуляць у нейкую гульню, з вялікім намаганнем выстаўляе сябе ў іншай ролі,— успамінае Валерый Васільевіч Беспразваны.

— Ён паказаўся мне нейкім надломленым. Відаць, інтуіцыя падказала,— гаворыць Васіль Іванавіч Вараб'ёў.

Сапраўды, за адзін такі выгляд, зусім не суадносны з воінскім статутам, ды і проста чалавечым аблічам, можна было затрымліваць гэтага прапаршчыка.



Вырашылі, што ў камендатуру яго будзе суправаждаць В. В. Беспразваны, а В. І. Вараб'ёў застанецца: служба ёсць служба.

Вось аб чым я падумаў. Ці было б усё так, калі б на месцы гэтых афіцэраў апынуліся іншыя? Як гавораць, здагадкі будаваць — рэч няўдзячная. Асабліва, калі ўсё адбылося...

Жанчына, што была ў «Жыгулях», амаль са слязамі ўпрошвала адпусціць мужанька. Маўляў, яго дакументы і на машыну яны забыліся, а дома бацькі хвалююцца, плача малое дзіця. Але ж усё было вырашана адразу, без ваганняў — даставіць у камендатуру, а там адразу высветліцца: хто ёсць хто.

В. В. Беспразваны — выдатны афіцэр. Стаж яго працы на ваеннай кафедры універсітэта невялікі, толькі-толькі будзе два гады. Але за гэты час ён заваяваў павагу таварышаў за высокі ўзровень падрыхтаванасці, рашучасць, іншыя рысы, якімі характарызуецца сапраўдны савецкі афіцэр. Таварышы аднадушна выбралі яго сакратаром партыйнай арганізацыі кафедры, ён — адказны за ваенна-патрыятычнае выхаванне. Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені, медалямі.

В. І. Вараб'ёў раней працаваў выхавацелем у Сувораўскім вучылішчы, і на ваеннай кафедры ён — сярод лепшых выкладчыкаў. Неаднаразова атрымліваў падзякі за поспехі ў навучанні падрастаючага пакалення.

— Можна зразумець чалавека, калі ён шчыры, гатоў папpавіць нейкую памылку — мы ніколі не выкрэсліваем такую магчымасць, калі знаходзімся на дзяжурстве. Але тут мы адчувалі: нешта не тое.

Як часта бывае, пры розных выпадках падышлі людзі, сталі прыслухоўвацца. Нейкая «спагадлівая» бабка накінулася: «Прычапіліся да хлопца. Адпусціце». Загудзелі астатнія.

...Селі ў машыну. В. В. Беспразваны паглядзеў, як за акном аўтамашыны застаўся В. І. Вараб'ёў. Яго постаць, здаецца, папярэджвала: «Пачакай, я з табой».

Машына неяк няўклюдна рванулася з месца, завіхляла заднімі коламі і рушыла рыўком наперад.

— Што вы думалі, Валерый Васільевіч, калі ехалі ў машыне з незнаёмымі?

— Наогул, думаць часу не было,— усміхаецца ён.—Увесь час прыйшлося супакойваць прапаршчыка, бо ён вёў машыну нервова, часта спыняўся рухавік. Ды ледзь не сутыкнуліся з аўтобусам. Прапанаваў астанавіцца, адпачыць.

...Валерый Васільевіч бацьку не памятае. Ён загінуў на фронце. Пятнаццацігадовым пайшоў працаваць на станкабудаўнічы завод імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Паступіў у політэхнічны інстытут. За плённую работу камандзірам студэнцкага будатрада ўзнагароджаны медалём «За асваенне цалінных зямель». І зараз ён заўсёды ставіць сябе на месца студэнтаў, ідзе насустрач ім. Але ж патрабавальнасці да сябе і сваіх вучняў не зніжае. Калі ўзнікаюць якія-небудзь пытанні, студэнты ідуць да яго. Валерый Васільевіч лічыць, што тут шкадаваць часу нельга, бо бачыць галоўную мэту сваёй работы ў выхаванні сапраўдных людзей, мужных і падрыхтаваных, якія не пашкадуюць жыцця дзеля Радзімы.

«Не стаяць на месцы, вучыцца кожны дзень» — гэта прынцып выкладчыка Васіля Іванавіча Вараб'ёва. Пасля заканчэння Ташкенцкага вышэйшага агульнавайскавога вучылішча служыў, неўзабаве выспела жаданне стаць выкладчыкам.



...У камендатуры адразу выкрылі ілжэ-прапаршчыка, бо вышук яго быў аб'яўлены па краіне. Ён даўно ўжо звольніўся, вёў паразітычны спосаб жыцця, і як страшэнны вынік — жорсткае забойства прыяцеля. Як паведамілі ў пракуратуры, следства вядзецца, таму расказваць падрабязнасці не будзем.

Вось так звычайнае дзяжурства афіцэраў ваеннай кафедры дапамагло выкрыць забойцу.

В. В. Беспразваны і В. І. Вараб'ёў здзівіліся, калі я прадставіўся — «з газеты». Па іх рэакцыі я зразумеў, што яны на гэтае затрыманне ўжо і забыліся, абодва лічаць, што нічога незвычайнага, геройскага не зрабілі. Гэта іх грамадзянскі абавязак. Яны — афіцэры, людзі адметнага складу.

Сын Васіля Іванавіча Паўлік пайшоў у першы клас. Колькі ж радасці было ў сям'і! Падабаецца яму ў школе. Як толькі прыходзіць бацька з работы, маленькі (ды ўжо «вялікі — у школу хаджу») спяшаецца хутчэй да таты, садзяцца побач, і пачынаецца трохі блытаны, але вясёлы, радасны расказ пра свет незвычайнай школьнай сям'і. Неўзабаве пойдзе ў школу і дачка Ірынка.

У Валерыя Васільевіча ў канцы мінулага года нарадзілася дачка Насценька. Зразумела, увесь вольны час ён праводзіць з маленькім чалавечкам. А старэйшая дачка — Вольга вырашыла паступаць у педагагічны інстытут.

Якое гэта шматграннае слова —жыццё. Яно змяняецца зараз імкліва. Як было б добра, калі б маленькай Насці і іншым дзецям ніколі не прыйшлося сустракацца ў жыцці з чалавекам, з якім сустрэўся яе бацька.

Толькі калі В. В. Беспразваны вярнуўся ў раён дзяжурства, то ўбачыў, як трывога і непакой у вачах таварыша — В. І. Вараб'ёва — зніклі.

Валерый Васільевіч расказаў... Яны моцна, па-мужчынску паціснулі адзін аднаму рукі. Да канца службы заставалася яшчэ гадзіна.

**А. СЦЯПАНАЎ.**

# Гарачыя зімовыя дзянёчкі

СЕСІЯ... СЕСІЯ... СЕСІЯ...

(Працяг. Пачатак на 1—2 стар.).

*— гоман, узрадаваны гоман — сябры віншуюць другакурсніцу Вольгу Мачуліну з паспяховай здачай чарговага заліку па англійскай мове. Хвіліна — і ўсё сціхае... Толькі турботны шэпт, ды хуткі шолах канспектаў парушае звон цішыні. Вунь дзяўчына старанна, раз за разам паўтарае формулу. Яе так ахапіла гэта практыкаванне, што яна і не заўважыла, як на яе накіраваўся фотааб'ектыў.*

*Дзве сяброўкі абмяркоўваюць, куды пайсці пасля заліку. І «хваляцца» адна перад другой, што часу на падрыхтоўку, як заўсёды, не хапіла. «Прарвёмся!» Тым не менш добра відаць, як яны хвалююцца: «А раптам не прарвуцца?» — і таму іх марам, хутчэй за ўсё, суджана застацца марамі.*

*А вось Алена Сцяпанава ўпэўнена ў сабе. І ў тым, што здасць залік па матэматыцы добра. Яна прыйшла на хімічны факультэт па прызванню, а не выпадкова. «Вучыцца, вучыцца... Так, хачу вучыцца. Мой бацька — хімік. Таму мы вырашылі зрабіць сямейную дынастыю хімікаў»,— гаворыць Алена.*

*А што робіцца на іншых факультэтах? Яшчэ адна пяцёрка ў залікоўцы Аксаны Шалатонінай, студэнткі IV курса механіка-матэматычнага факультэта. Хвалююцца перад экзаменам па гісторыі савецкай журналістыкі студэнткі IV курса II групы. Па-ранейшаму добра здае экзамены студэнт IV курса журфака Міхась Халамаў. Турбуецца каля дошкі юнак, не ведаючы, што хоча ад яго выкладчык.*









*Хтосьці ў чарговы раз угаворвае сябе з наступнага семестра сур'ёзна ўзяцца за вучобу, хтосьці, на чым свет стаіць, кляне «беспрынцыповага» выкладчыка. За тое, што ён не ўнік у сямейнае становішча... Усё гэта — экзаменацыйная сесія.*

*«Лыжная прагулка ў нядзелю не перашкаджае здаваць добра сесію, а наадварот»,— мусіць так лічаць студэнткі факультэта журналістыкі Нэля Марцінкевіч і Святлана Раманава. Дзяўчатам можна пазайздросціць: відаць, часу ў іх хапіла і на падрыхтоў-*

(Заканчэнне на 4-й стар.).

СЕСІЯ... СЕСІЯ... СЕСІЯ...

## Гарачыя зімовыя дзянёчкі







(Заканчэнне.
Пачатак на 1—3 стар.).

ку, і на адпачынак. Значыць, першы семестр прайшоў для іх напружана і плённа. Хочацца спадзявацца, што і ў наступным семестры дзяўчаты размяркуюць свой час таксама разумна і мэтазгодна. Таго ж хочацца пажадаць і ўсім студэнтам. З сесіяй вас! Выдатных адзнак і ведаў! Добрага настрою вам і вашым экзаменатарам!

*Фота і тэкст*
**А. ВАЛОШЫНА.**

# Я быў па той бок стала

**ВЫДУМЛЯЦЬ НІЧОГА** не стану. Раскажу ўсё, як было. Дык вось, памятаю, як зараз, прыйшлі мы на апошні экзамен у першую сесію. Як заўсёды, я панёс кветкі. А наш экзаменатар і гаворыць: «Вы хто?» Я падумаў, што б такое адказаць, каб не ўпасці ў яго вачах, ды і бацнуў: «Я — праforг». «Сядайце, будзеце весці «бухгалтэрыю», залікоўкі афармляць». Узрадаваўся я, стаў парадак наводзіць, выйду ў калідор — там аднагрупнічкі калоцяцца, не хочуць ісці. А я давай падбухторваць, маўляў, не затрымлівайце тут нас, заходзьце, а не то я вам такіх адзнак настаўлю, што да V курса не разлічыцеся.

Задаволены выкладчык, што праforг такі актыўны трапіў, пакурвае, газеты чытае. Неўзабаве пацягнуліся адказваць.

І тут пачалося. Першай села да нас Людка Чыкіна. Памятаю, у пачатку вучобы падышоў неяк да яе, гавару яшчэ так, па-першакурсніцку, няўпэўнена: «Люд, Люд... Гэта... м... можа ў кіно сходзім. На гэт-та — «Раманс»... «Жорстк-кі раманс»? А яна: «П'есу чытала. Ды ў кіно я з дзяўчатамі хаджу». А сёння яна так апранулася — ведаеце, бываюць такія выразы ад шыі і трошкі ніжэй. Гавораць, што ў Францыі гэта «трошкі» бывае да раменьчыка. Не сказаць, каб Людка была падобна на якую-небудзь Жаржэтту, але ў той час турчанку яна дакладна нагадвала. І яшчэ быў мантаж, ці як там у вас, прыгажуні,— макінтаж. Дык яна так замантажыравалася, што як глянеш на яе, здаецца, ток у 220 вольт б'е, адным словам — вялікі накал страсцей. Я стаў глядзець у акно. А яна гаварыла аб усім — аб модзе, аб жанчынах і аб мужчынах. Потым штосьці па білету. Выкладчык стаў яе папраўляць, растлумачваць пытанні, але стараўся ў яе бок не глядзець. Яна свайго дамаглася — каб з ёй развітацца, паставілі хутчэй «здавальняюча» і адпусцілі, дакладней, яна пакінула нас.

Зайшоў Сямён Макаў. У яго быў свой метад затлуміць галовы і Уладзіміру Мікалаевічу, і мне. Увесь адказ яго быў насычаны трыма сказамі. Ён з глыбокім філасофскім выглядам жангліраваў словамі, як цыркач. То так, то гэтак — адно і тое ж. Патрохі я адчуў, як у мяне спачатку ў вушах, а потым і недзе ў цэнтры галавы нешта складваецца, як дзіцячая мазаіка. Потым разбураецца, складваецца зноў, быццам бы тое, што было, але ў іншай паслядоўнасці.

Выкладчык пачаў расказваць матэрыял. Спытаў, ці ўсё зразумела. Макаў паглядзеў на яго і гаворыць: «Дык я ж гэта самае і хацеў адказваць. Дакладна так, як вы гаварылі, толькі ў апошнім сказе я б памяняў месцамі першыя словы». Ён пайшоў пераможцам, з гонарам размахваючы залікоўкай, якая для яго стала падобнай на чырвоны дыплом. Я ж пачырванеў ад іншага. І не змог глядзець у вочы Уладзіміру Мікалаевічу. Я зразумеў, што ў гэтым не лепшы за ўсіх. І я таксама іду на экзамен, як на бой з выкладчыкам.

Трэцяй адказвала Іра Сокал. Мне спачатку было цікава, бо я ніколі не чуў, каб яна гаварыла. Смяялася ці плакала. Зараз тут была быццам і яна, і не яна. Іра гаварыла так, быццам плакала. І неўзабаве ўжо рыдаў Уладзімір Мікалаевіч — эх, добры стары. Ды што там, з мяне яна высекла слязы дзве-тры. Мы плакалі за тое, што ёй сумна ў вялікім горадзе, што ў вёсцы засталіся бацькі, што ёй вельмі патрэбна стыпендыя. Калі залікоўка прапіталася нашымі слязьмі, я паставіў «выдатна», Мікалаевіч распісаўся.

Было чуваць, як за дзвярыма яна ўсхліпвае і прычытае: «Ну і воўк гэты гісторык! Мучыў, мучыў, аж да слёз давёў. Цяпер усю ноч не засну».

У дзве гадзіны, калі скончыўся экзамен, я ўжо не рэагаваў ні на што. Ні на слёзы, ні на святло, ні на словы Уладзіміра Мікалаевіча. Я нешта ўсё ўсміхаўся, праз хвілін дзесяць пачаў іржаць неяк не па-чалавечы. Добры стары рабіў мне прымочкі, збегаў да дэкана за нейкімі таблеткамі...

Зімовыя канікулы прайшлі для мяне з вялікай карысцю. Я ачуняў і ў другім семестры сустрэўся з аднагрупнікамі, схадзіў у кіно з Людкай Чыкінай, выпіў квасу з Сямёнам, ну і трошкі аднойчы паплакаў з Іркай — калі дынамаўцы прайгралі «Арарату». Мы жылі нармальным жыццём, да сесіі было тры месяцы. Ды ўсё роўна больш па той бок экзаменацыйнага стала я не сяду. выкладчыкам не буду ніколі. Вырашыў цвёрда.




# Напісана на твары...

ГАРАСКОПЫ АДЖЫЛІ СВАЁ. У сучасны момант яны ўяўляюць цікавасць толькі з займальнага боку. Аднак існуюць і навуковыя спробы вызначэння характару жыцця студэнта. У гэтым выпадку мы маем на ўвазе псіхалагічны аналіз характару студэнта ў фізіялагічным аспекце вывучэння.

Прапануем матэматычныя разлікі па знешніх прыкметах галавы.

ПЕРШЫ ТЫП. Твар круглявай формы, нярэдка паўнаваты. Студэнты з такімі прыкметамі сустракаюцца часцей адразу пасля школы, на І курсе. Звычайна гэта людзі слабай сілы волі. У пачатку студэнцкага жыцця ім даводзіцца сустракаць хвалю непрымання, якая хутка спадае, бо пра іх забываюцца. Успамінаюць толькі ў буфеце або ў перапоўненым тралейбусе, адчуваючы на сабе іх мяккія бакі па суседству.

Разлікі адносна сучаснай сесіі: не перажывайце, што тысяча старонак матэрыялу і вучыць — адну ноч, што вы ўжо, здаецца, пачалі худзець ад недасыпання. Не хвалюйцеся — у другім семестры вы нагоніце былую вагу. Год тыгра для вас шчаслівы. Ён будзе багаты на ўраджай, таму галаданне вам не пагражае. Сесію вы здасце добра — вас пашкадуюць з-за адзення, якое стане крыху прасторным, і цёмных кругоў пад вачыма.

ДРУГІ ТЫП. Твар выцягнуты. Часцей за ўсё студэнты гэтага тыпу не могуць правільна размеркаваць свае справы і таму ў ноч перад экзаменам лічаць зоркі, прахожых, або пад настольнай лямпай сачыняюць кароткі пераказ «Іліяды» ў перакладзе з Гнедзіча. На экзамене, выцягнуўшы білет, робяць спалоханы выгляд і ледзь не млеюць. Запінаючыся, доўга адказваюць, пры гэтым ствараецца ўражанне, што яны ўсё ведаюць дрэнна.

Так адбудзецца і на гэты раз. Аднак студэнты з такім тыпам твару, але яшчэ і з гарбінкай на носе, атрымаюць добрыя і выдатныя адзнакі. Год тыгра для многіх будзе цудоўным, але — нешчаслівым для іх навакольных.

ТРЭЦІ ТЫП. Авальны твар. Вельмі распаўсюджаная форма. Сустракаецца на ўсіх факультэтах і вуліцах. Уявіць усе агульныя заканамернасці развіцця немагчыма. Можна абмежавацца толькі заўвагай: рубяжы агульных вынікаў пасля сесіі дыяметральна процілеглыя: ад адлічэння — да «выдатна».

ЧАЦВЁРТЫ ТЫП. Твар трохвугольнай формы. Сустракаецца даволі рэдка пры трохвугольнай галаве, таму хутка звяртае на сябе ўвагу і ўспамінаецца некалькі пазней, як нешта арыгінальнае і малавывучанае.

Студэнты гэтага тыпу сустракаюцца ў асноўным сярод мужчынскага насельніцтва, вылучаюцца высокім ростам і доўгімі рэсніцамі. Маюць здольнасць да гандлю і дакладных навук.

Сесія для вас пройдзе не вельмі паспяхова: выкладчыкі гуманітарных дысцыплін не зразумеюць, аб чым вы расказваеце гадзіну, таму што вы не зразумелі, аб чым вас спыталі гадзіну назад.

І, бадай, апошні тып — твар мае квадратную форму. Людзі такога тыпу сустракаюцца надзвычайна рэдка між студэнтаў, асабліва БДУ. Таму і гаварыць аб іх няма чаго.

— ГЭТА — лёс! — усклікнула студэнтка.— Я ўчора здала залік у чырвоных панчохах і зялёным шаліку. І сёння здам, таму што пайду ў гэтым жа!

— А вось і не здасі, — запэўніла сяброўка.— Сукенку тваю ўчарашнюю, жоўтую, я мыць замачыла...

— Значыць, не пайду...

# РАДЫ ПАРАДАМ?

*СЕСІЯ ДАСЯГНУЛА свайго апагею. Што гэта такое, тлумачыць студэнту студэнтам не трэба. Замест тлумачэння ЛІФТёры, нягледзячы на сваё такое ж нялёгкае становішча, вырашылі крыху падбадзёрыць сваіх паважаных чытачоў пазачарговым выпускам і шчыра падзяліцца з імі некалькімі каштоўнымі парадамі.*

*1. Перад экзаменам, калі вы адчуваеце сябе няўпэўнена і слабасць у нагах і ў вас ад гэтага ўзнялася тэмпература — самая лепшая парада — ідзіце прамёнька не ў паліклініку, а на экзамен, і нікога не бойцеся. Магчыма, вас чакае шчаслівы выпадак?! (Захварэў выкладчык, пачаўся каранцін). Калі вы ведаеце па выцягнутаму білету, што нічога не ведаеце, не трэба адчайвацца. Змагайцеся да апошняга! (Раптам экзаменатар захоча выйсці ў буфет, і вы атрымаеце, такім чынам, ідэальныя ўмовы для падрыхтоўкі). Карацей, калі вы адчуваеце свае справы дрэннымі, лепш спадзявайцеся ў такім разе на «а можа ды няхай», чым на тое, што ў наступным семестры вы падрыхтуецеся лепш. Галоўнае — не паддавайцеся настрою, не пакідайце поля бітвы за стыпендыю да апошняга.*

*2. Разам з верай ў выратавальнае «а можа» вам павінны дапамагчы некаторыя прыкметы, якімі карысталася не адно пакаленне студэнтаў.*

*Студэнцкая мудрасць кажа: «Ніколі нельга вяртацца, калі нешта забыліся, нават калі гэта — залікоўка. Не пашанцуе!»*

*«Калі пакласці пад левую пятку загавораны пятачок і гэта не акажа добрага ўплыву на адказ, у пераздачу лепш купіце ад сябе асабіста на пяць рублёў выкладчыку кветак».*

*«Па адзенню сустракаюць — па розуму праводзяць. Таму лепш на экзамен апрануцца сціпла, але з густам, чым шыкоўней за выкладчыка».*

*Мы спадзяемся, што гэтыя шчырыя парады прыдадуць, каму не хапае, упэўненасці і добрага настрою, у каго ён сапсаваны. І напамінаем, што наперадзе вас чакае прыемная пара канікулаў і магчымасць зноў атрымаць стыпендыю (каму патрэбна) у наступную сесію...*




Сёння на Лірычна-Іранічным Факультэце залік па гумару атрымалі *С. Шапран, А. Чарняўскі*. Прымала — *А. Віхрова*.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.
16 студзеня 1986 г.
Зак. 95. АТ 07029.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.